БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

Аб’ект аўтарскага права

УДК 352.075.31(476)(091)«18/19»

**Ляпешкін**
**Яўген Мікалаевіч**

# Губернатарскі корпус у Беларусі (1864 – люты 1917 г.)

Аўтарэферат
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук
па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

Мінск 2024

Навуковая работа выканана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце.

Навуковы кіраўнік – **Лукашэвіч Андрэй Міхайлавіч,**
доктар гістарычных навук, прафесар,
прафесар кафедры гісторыі Беларусі новага
і навейшага часу
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Афіцыйныя апаненты: **Лаўрыновіч Дзмітрый Сяргеевіч,**
доктар гістарычных навук, прафесар,
першы прарэктар
УА "Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя А.А. Куляшова";

**Шымуковіч Сяргей Фадзеевіч,**
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
дацэнт кафедры эканамічнай гісторыі
УА "Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт".

Апаніруючая арганізацыя – УА "Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Янкі Купалы".

Абарона адбудзецца «5» чэрвеня 2024 г. у 16.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.05 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце па адрасе: Мінск, вул. Ленінградская, 8 (корпус юрыдычнага факультэта), аўд. 407.

Паштовы адрас: пр-т Незалежнасці, 4, Мінск, 220030.

Тэлефон вучонага сакратара: 209-57-09; e-mail: huzhalouski@gmail.com.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Фундаментальнай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Аўтарэферат разасланы «26» красавіка 2024 г.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый
доктар гістарычных навук прафесар А.А. Гужалоўскі

# УВОДЗІНЫ

Захаванне нацыянальнага суверэнітэту, умацаванне беларускай дзяржаўнасці і ўдасканаленне сістэмы кіравання патрабуе глыбокага вывучэння мінулага Беларусі, у тым ліку і прадстаўнікоў улады.

Губернатарскі корпус з'явіўся на тэрыторыі Беларусі пасля далучэння яе да Расійскай імперыі ў канцы XVIII ст. у выніку падзелаў Рэчы Паспалітай. Але з першых дзён ён меў пэўныя асаблівасці. У беларускіх губернях адрозненні ад цэнтральных рэгіёнаў захоўваліся і ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

У дысертацыйнай працы пад збіральным тэрмінам "губернатарскі корпус" разумеецца сукупнасць губернатараў, як асобная катэгорыя службовых асоб, з'яднаных агульнымі прафесійнымі правамі і абавязкамі, і якія з'яўляліся вышэйшымі прадстаўнікамі мясцовай улады ў губерні. У 1864–1917 гг. кіраўнікі губерняў прызначаліся і звальняліся імператарам, былі падведамаснымі МУС. Губернатары (начальнікі губерняў) дзейнічалі праз асабістую канцылярыю, губернскае праўленне і іншыя ўстановы, мелі ў падпарадкаванні губернскую адміністрацыю і паліцыю. *Актуальнасць тэмы даследавання* абумоўлена шэрагам прычын. З аднаго боку, вывучэнне інстытутаў улады і іх прадстаўнікоў у мінулым (прававое становішча і функцыянаванне губернатараў, адносіны з органамі цэнтральнай і мясцовай улады, падбор кадраў) важна для разумення механізмаў кіравання ў сучаснай дзяржаве. З другога боку, у айчыннай гістарычнай навуцы даследаванне пытанняў, звязаных з мясцовым кіраваннем, застаецца адным з прыярытэтных кірункаў, якое патрабуе дадатковай распрацоўкі (рэгіянальныя асаблівасці, кантроль за самакіраваннем).

Для вызначэння асаблівасцей функцыянавання на тэрыторыі Беларусі губернатарскага корпуса было неабходна раскрыць функцыі губернатараў, іх адносіны ў вертыкалі ўлады, механізм кіравання і кантролю за рознымі ўстановамі і грамадскімі інстытутамі (у т. л. за самакіраваннем), зрабіць сацыяльную характарыстыку кіраўнікоў губерняў. Між тым у сістэме ўлады не разглядаліся адносіны з падпарадкаванымі губернатару органамі, а толькі з асобамі, якія фарміравалі вертыкаль кіравання. Віцэ-губернатар, хаця і падначальваўся губернатару, але замяшчаў яго ў выпадку адсутнасці, таму іх стасункі таксама прасочваюцца.

Пры раскрыцці механізма кіравання і кантролю перавага аддавалася губернскім установам. Структуры павятовага ўзроўню не даследаваліся, паколькі з імі губернатары, у пераважнай ступені, не ўзаемадзейнічалі. Кантроль за грамадскімі арганізацыямі, палітычнымі партыямі і рухамі з'яўляўся прэрагатывай палітычнай паліцыі, таму ў дысертацыі ён не разглядаўся. Увага акцэнтавалася на кіраўнічым аспекце і асабістых якасцях службоўцаў, ад якіх залежалі характар і тэмп ажыццяўлення ўрадавай палітыкі на месцах (сама дзейнасць з'яўляецца тэмай асобнага даследавання, і таму яна не разглядаецца).

Выбар *храналагічных граніц даследавання,* якія ахопліваюць перыяд з 1864 г. па люты 1917 г., – абумоўлены наступнымі фактарамі. Ніжняя мяжа звязана з тым, што пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. у Беларусі і Літве была скасавана пасада часовага ваеннага губернатара, а ўсе паўнамоцтвы па кіраванні губерняй перадаваліся губернатару, які з 1864 г. афіцыйна згубіў дадатак “грамадзянскі” і стаў называцца “губернатар”. Верхняя граніца даследавання вызначаецца падзеямі Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г., якая прывяла да ліквідацыі губернатарства, як асобнага інстытута кіравання, і скасавання губернатарскага корпуса. *Тэрыторыя*, якую ахоплівае даследаванне, уключае Віленскую, Віцебскую, Гродзенскую, Магілёўскую і Мінскую губерні Расійскай імперыі. У дысертацыі пад тэрмінамі “Беларусь” і “беларускія губерні” аўтар разумее згаданыя пяць губерняў.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЦЫ

**Сувязь працы з навуковымі праграмамі (праектамі), тэмамі**

Дысертацыя падрыхтавана ў рамках навукова-даследчай работы “Сацыяльныя змены ў грамадстве ва ўмовах капіталістычнай трансфармацыі эканомікі Беларусі (1861–1914 гг.)”, якая выконвалася на кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта БДУ ў 2016–2020 гг. (Дзяржаўная праграма навуковых даследаванняў “Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства”, падпраграма № 1 “Гісторыя і культура”, нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20161683).

**Мэта і задачы даследавання**

*Мэтай* дысертацыйнага даследавання з’яўляецца выяўленне асаблівасцей функцыянавання губернатарскага корпуса і яго кадравага складу ў Беларусі ў 1864 – лютым 1917 г.

Для дасягнення мэты даследавання былі пастаўлены наступныя *задачы*:

- прасачыць эвалюцыю функцый інстытута губернатарства ў Беларусі ў 1864–1917 гг.;
- выявіць адметнасці функцыянавання губернатарскага корпуса ў надзвычайных умовах (рэвалюцыя, вайна);
- раскрыць узаемаадносіны ў вертыкалі ўлады (праз стасункі губернатараў з міністрам унутраных спраў, генерал-губернатарам і віцэ-губернатарам);
- вызначыць механізм губернатарскага кіравання;
- выявіць асаблівасці сістэмы кантролю начальнікаў губерняў;
- раскрыць прынцыпы падбору, прызначэння і звальнення губернатараў у Беларусі і скласці іх агульны сацыяльны партрэт.

*Аб’ектам* даследавання з’яўляецца адміністрацыйны апарат расійскай дзяржаўнай улады на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

*Прадметам* даследавання – губернатарскі корпус у Беларусі, яго функцыі, узаемаадносіны ў вертыкалі ўлады, механізм кіравання і кантролю, сацыяльны партрэт у 1864 – лютым 1917 г.

**Навуковая навізна**

У дысертацыі прасочана прававая эвалюцыя функцыянавання інстытута губернатарства ў Беларусі ў 1864 – лютым 1917 г., удакладнены механізм узаемадзеяння міністра ўнутраных спраў, генерал-губернатара і віцэ-губернатара з губернатарамі. Паказана, што ў надзвычайных умовах (рэвалюцыя, вайна) уладныя паўнамоцтвы губернатараў за кошт паліцэйска-кантрольных функцый пашыраліся. Вызначана, што губернатарскі корпус на тэрыторыі Беларусі з'яўляўся часткай агульнарасійскага інстытута губернатарства і меў пэўныя асаблівасці. Паказана, што ў сувязі з ускраінным становішчам рэгіёна, начальнікі беларускіх губерняў мелі абмежаваную свабоду дзеянняў (наяўнасць інстытута генерал-губернатарства), але валодалі большым наборам функцый і паўнамоцтваў (пераважна гаспадарчых і сацыяльных). Вызначана, што ўзаемасувязі губернатара з генерал-губернатарам і кіраўніком МУС праяўляліся: у працэдуры прызначэння і звальнення губернатара; ва ўзгадненні кадравых рашэнняў у губерні; пры стварэнні і прадстаўленні справаздачных дакументаў. Выяўлена, што дзейнасць начальнікаў губерняў кантралявалася праз іх справаздачнасць. Раскрыты адносіны з віцэ-губернатарам, якія складваліся ў дыяпазоне ад даверлівых да супрацьстаяння. Паказана, што ў выпадках адсутнасці паразумення – адзін з чыноўнікаў імкнуўся перавесці свайго саслужыўца ці перавесціся сам у іншую губерню.

Выяўлены механізм губернатарскага кіравання і кантролю ў беларускіх губернях. Прааналізавана заканадаўства па гэтай праблеме, разгледжаны падбор, прызначэнні і зацвярджэнні супрацоўнікаў у адміністрацыйнай, гаспадарчай, сацыяльнай сферах і самакіраванні, механізм зацвярджэння (адабрэнне ці прыпыненне) пастаноў органаў самакіравання. Паказана, што непасрэднае кіраванне губернатара ажыццяўлялася праз органы, дзе ён старшынстваваў, ці якія знаходзіліся ў яго падпарадкаванні (ім аддаваліся распараджэнні і прадпісанні). Даказана, што губернатарскі кантроль адбываўся за пэўнымі структурамі (самакіраванне, неправаслаўныя канфесіі), якія не былі яму непасрэдна падуладныя, але з якімі ён меў адносіны. Нагляд за імі ажыццяўляўся праз старшынства губернатара ва ўстановах, якія выконвалі пасрэдніцкую ролю, але самі яму не падначальваліся; і праз адміністрацыйныя працэдуры.

Акрэслены прынцыпы падбору на пасады губернатараў, вылучаны фактары, якія ўплывалі на прызначэнні (службовы досвед, адукацыя, паходжанне, веравызнанне, сваяцкія сувязі, службовыя кантакты, пратэкцыя), раскрыты прычыны звальненняў (злоўжыванні, змена ўрадавага курсу ў рэгіёне, крызісныя з'явы, стан здароўя). На аснове аналізу біяграфічных дадзеных губернатараў (узрост, тэрмін кіравання, паходжанне, веравызнанне, землеўладанні, адукацыя, тытулы,

чыны, пасады, сямейнае становішча) ахарактарызаваны асабісты склад губернатарскага корпуса ў Беларусі за 1864–1917 гг. У навуковы ўжытак уведзена пэўная колькасць новых крыніц (губернатарскія справаздачы, фармулярныя спісы).

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Губернатарскі корпус у Беларусі ў 1864–1917 гг. з'яўляўся часткай агульнарасійскага інстытута губернатарства. Разам з тым ён меў і пэўныя асаблівасці, што знайшло адлюстраванне як у заканадаўстве, так і на практыцы. Начальнікі беларускіх губерняў, у сувязі з геапалітычным становішчам рэгіёна, мелі тут меншую свабоду дзеянняў (наяўнасць генерал-губернатараў), але валодалі большым наборам функцый і паўнамоцтваў (пераважна гаспадарчых і сацыяльных). Правядзенне ў беларускіх губернях з пэўным спазненнем і абмежаваннем рэформаў 1860–1870-х гг. не прывяло да ўмацавання мясцовых выбарных органаў улады (земствы не ўводзіліся да пачатку ХХ ст.). Судовыя ўстановы ствараліся са спазненнем, пры гэтым губернатары маглі аказваць уплыў на кадравыя прызначэнні ў судовай сферы. Таму ў 1864–1875 гг. у беларускіх гарадах (да ўвядзення ў 1875 г. Гарадавога палажэння) і ў 1864–1903 гг. у губернях (у Віленскай і Гродзенскай, дзе земствы не ўводзіліся, – і надалей) сацыяльныя і эканамічныя функцыі ў асноўным ажыццяўляў губернатар. У той жа час у цэнтральных губернях Расійскай імперыі гэтыя функцыі з 1864 г. перакладаліся на земствы, а з 1870 г. і – на гарадское самакіраванне. У выніку на тэрыторыі Беларусі губернатары захавалі моцныя ўладныя пазіцыі як у агульнай сістэме кіравання, так і ў дачыненні да мясцовага самакіравання (у цэнтральна-ўсходняй частцы больш, чым у заходняй).

2. Падчас надзвычайнай сітуацыі (рэвалюцыя, вайна) уладныя паўнамоцтвы губернатараў пашыраліся за кошт магчымасці выдання абавязковых пастаноў, прыцягнення войск і іншых паліцэйска-кантрольных функцый. Найбольш выразна гэта выявілася ў перыяд расійскай рэвалюцыі 1905–1907 гг. і ў гады Першай сусветнай вайны. У рэвалюцыйныя гады выключныя меры, накіраваныя на падтрымку грамадскага парадку, часам прыводзілі да гвалту над насельніцтвам і трагедый падобна “Курлаўскаму расстрэлу”. У якасці зваротнай рэакцыі, губернатары нярэдка і самі станавіліся ахвярамі гвалту з боку апазіцыйных дзеячаў і арганізацый. Гэта абумовіла ўзмацненне ратацыі кадраў. Падчас Першай сусветнай вайны ў беларускіх губернях уводзілася ваеннае становішча, таму губернатары падпарадкоўваліся, акрамя міністра ўнутраных спраў, ваенным начальнікам, прычым кантакты з апошнімі мелі больш істотнае значэнне. Губернатар выступаў ключавым звяном у ажыццяўленні зносін паміж ваенным начальствам і грамадзянскім насельніцтвам. Пры неабходнасці начальнікі губерняў у сваім кіраванні выкарыстоўвалі надзвычайныя паўнамоцтвы вайскоўцаў. Са згоды ваеннага кіраўніцтва яны маглі адпраўляць злачынцаў у ссылку за межы губерні. Для мясцовых жыхароў гэта азначала ўзмацненне кантролю з боку адміністрацыі.

3. Пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. на тэрыторыі Беларусі пэўны час захоўвалася ваеннае становішча. Таму віцебскія і магілёўскія (да 1869 г.) і мінскія (да 1870 г.) губернатары былі падпарадкаваны віленскаму генерал-губернатару. Пры гэтым начальнікі Гродзенскай і Віленскай (разам з Ковенскай) губ. падначальваліся віленскаму генерал-губернатару да скасавання гэтага інстытута ў 1912 г. Пасля зняцця ваеннага становішча (1868–1871 гг.) губернатары сталі больш самастойнымі ў кіраванні губерняй: яны маглі выступаць з ініцыятывамі, якія не закраналі асноў існуючага рэжыму. Тым не менш любое важнае рашэнне патрабавала ўзгаднення з МУС. Адносна сваіх падначаленых і насельніцтва губернатар з'яўляўся паўнапраўным начальнікам, хаця яго паўнамоцтвы былі абмежаваны міністэрствам. Узаемаадносіны губернатара з генерал-губернатарам і міністрам унутраных спраў праяўляліся: у працэдуры прызначэння і звальнення губернатара; ва ўзгадненні кадравай палітыкі ў губерні; пры стварэнні і прадстаўленні справаздачнай дакументацыі. Праз усе з іх ажыццяўляўся кантроль за губернатарскай дзейнасцю. Стасункі з віцэ-губернатарам будаваліся розныя: ад даверлівых да супрацьстаяння. Калі не ўдавалася дасягнуць паразумення – адзін з чыноўнікаў імкнуўся перавесціся сам ці перавесці свайго калегу ў іншую губерню. Нягледзячы на тое, што закон абавязваў віцэ-губернатара падпарадкоўвацца і дапамагаць губернатару, а таксама займацца справамі губерні падчас адсутнасці апошняга, на практыцы так адбывалася не заўсёды. Падчас Першай сусветнай вайны (з канца 1915 г.) за губернатарамі пакідалася агульнае кіраўніцтва губерняй, а загадванне бягучымі справамі ўскладалася на віцэ-губернатара.

4. Механізм адміністрацыйнага кіравання губернатара заключаўся ў наглядзе за ўстановамі грамадзянскага ведамства, рэвізіі прысутных месцаў. Кіраўнік губерні вырашаў кадравыя пытанні, распараджаўся аб прыцягненні да адказнасці вінаватых у злоўжываннях чыноўнікаў, назіраў за правільным вырашэннем спраў у губернскім праўленні, узнагароджваў службоўцаў, патрабаваў справаздачнасць падведамасных установаў, сачыў за зборам статыстыкі. У справах эканомікі губернатарскі кантроль ажыццяўляўся праз установы, дзе ён старшынстваваў, ці праз залежныя ад яго органы і службовыя асобы. У Беларусі губернатар меў большы нагляд у лясной гаспадарцы і падаткаабкладанні (частка членаў губернскіх установаў замянялася асобамі па распараджэнні, прадстаўленні ці прызначэнні губернатара), у сувязі з пазнейшым увядзеннем земскіх установаў і толькі ў трох губернях. У дачыненні казённых палат і ўпраўлення дзяржаўных маёмасцяў губернатар ажыццяўляў нагляд (паведамляў заўвагі ім і вышэйшаму начальству), а таксама (за выключэннем кантрольных палат) праводзіў рэвізіі.

У кіраванні сацыяльнай сферай губернатар старшынстваваў ці ўваходзіў у склад кіраўніцтва многіх апякунскіх установаў, або яны залежалі ад губернскага праўлення (дзе губернатар быў старшынёй). Начальнік губерні меў права

зацвярджэння статутаў гарадскіх папячыцельстваў аб бедных у губернскіх гарадах (з 1903 г.) і дабрачынных таварыстваў (з 1911 г.). Акрамя таго, ён прызначаў кіраўнікоў некаторых навучальных устаноў. На тэрыторыі Беларусі губернатар удзельнічаў у сацыяльнай апецы (праз старшынства ў прыказах грамадскай апекі, якія існавалі тут да пачатку ХХ ст.) у большай ступені і больш працяглы перыяд, у параўнанні з унутранымі расійскімі губернямі. Да судовай рэформы 1864 г. (пачалася ў Беларусі ў 1872 г.) губернатар наглядаў за судом. Са скасаваннем аб'яднаных палат грамадзянскага і крымінальнага суда (1883 г.) губернатарскі кантроль спыняўся. Таму на тэрыторыі Беларусі губернатар умешваўся ў справы суда больш працяглы час, чым у цэнтральных расійскіх губернях.

5. У дачыненні да дваранскага самакіравання, кіраўніцтва якога ў Беларусі прызначалася (па прадстаўленні кіраўніка МУС і начальніка губерні), губернатарскі кантроль аслаб, у адрозненне ад цэнтральных расійскіх губерняў, дзе існавалі дваранскія выбары. Губернатар у Беларусі кантраляваў сялянскае самакіраванне праз старшынства ў губернскай па сялянскіх справах прысутнасці (губернскай прысутнасці); рэвізіі валаснога кіравання і справаводства органаў па сялянскіх справах; спыненне выканання пастаноў губернскай прысутнасці (даносячы ў МУС); звальненне з пасад службоўцаў валаснога і сельскага кіравання з-за парушэння імі сваіх абавязкаў. У Беларусі ў механізме нагляду за сялянскім грамадскім кіраваннем губернатару надавалася бо́льшае значэнне (органы па сялянскіх справах не мелі выбарнасці, а камплектаваліся праз прызначэнні з удзелам губернатара). Пасля гарадской рэформы 1870 г. (у Беларусі пачалася з 1875 г.) губернатар наглядаў за гарадскім самакіраваннем праз сваё старшынства ў губернскай па гарадскіх (з 1892 г., дзе былі земствы – па земскіх і гарадскіх) справах прысутнасці (дарэформеннай гарадской думе ён рабіў прадпісанні). Губернатар правяраў на законнасць пастановы гарадской думы. Акрамя таго, асобы, абраныя кіраўнікамі гарадоў (акрамя губернскіх), зацвярджаліся на пасадзе губернатарам (калі абраная кандыдатура не выклікала сумнення). З 1892 г. начальнік губерні назіраў за законнасцю і правільнасцю дзеянняў гарадскога самакіравання, мог спыняць у некаторых выпадках выкананне пастаноў думы. Губернатар ажыццяўляў кантроль над выбарнымі земскімі ўстановамі (праз старшынства ў губернскіх па земскіх і гарадскіх справах прысутнасцях; нагляд за законнасцю і правільнасцю іх дзейнасці; зацвярджэнне на выбарныя пасады; зацвярджэнне ці спыненне выканання асобных пастаноў земстваў; хадайніцтвы губернскага земскага сходу аб мясцовых патрэбах ва ўрад; праверкі ўстаноў, падначаленых земству).

Губернатар спрыяў дзейнасці праваслаўнай царквы, але не кантраляваў яе. У той жа час для нагляду за іншымі канфесіямі ён выкарыстоўваў адміністрацыйныя рычагі (дазвол на адкрыццё малітоўнай установы, пасрэдніцтва пры пераходзе з праваслаўя ў іншае веравызнанне). Прычым у цэнтры ўвагі

губернатараў у Беларусі знаходзіўся каталіцкі касцёл (у адрозненне ад цэнтральных расійскіх губерняў).

6. У другой палове XIX – пачатку XX ст. губернатары прызначаліся на пасады і звальняліся з іх імператарам, па прадстаўленні кіраўніка МУС. Перад тым як узначаліць губерню існавала фармальная працэдура, якая ўключала тры этапы: кандыдацтва, знаходжанне на пасадзе і зацвярджэнне. Прынцыпы адбору будучых губернатараў не вызначаліся ў заканадаўстве. Аднак улічваліся дзелавыя здольнасці кандыдата, яго асабістыя дадзеныя (службовы досвед, адукацыя, паходжанне, веравызнанне) і ўплыў асоб (сваяцкія сувязі, службовыя кантакты, пратэкцыя). Ад губернатарскай пасады вызвалялі па розных прычынах: за выяўленыя злоўжыванні; у выніку змены ўрадавага курсу ў рэгіёне; у сувязі з крызіснымі з’явамі; па стане здароўя. Але часцей чыноўнік перамяшчаўся на працу ў іншы рэгіён, ці на павышэнне (або прылічаўся да МУС). У Беларусі, акрамя міністра ўнутраных спраў, значную ролю ў прызначэннях і звальненнях губернатараў адыгрываў генерал-губернатар (калі існавала гэта пасада). Пасля паўстання 1863–1864 гг. губернатарскі корпус у Беларусі камплектаваўся пераважна з чыноўнікаў праваслаўнага ці лютэранскага веравызнання. Між тым досвед працы з каталіцкім і іўдзейскім насельніцтвам не быў прыярытэтным у прызначэннях на губернатарскія пасады.

Начальнікі беларускіх губерняў у разгледжаны перыяд былі часцей за ўсё выхадцамі з цэнтральных губерняў Расіі (41 з 68 чалавек паходзілі з унутраных расійскіх губерняў, ці 60,3%), па веравызнанні – у асноўным праваслаўнымі (54 асобы, ці 79,4%), па саслоўным паходжанні – спадчыннымі дваранамі (63 асобы, ці 92,7%), мелі землеўладанні (42 асобы, ці 61,8%), валодалі высокім узроўнем адукацыі (вышэйшая – 41 асоба, ці 60,3%, сярэдняя спецыяльная – 26 асоб, ці 38,2%), мелі шматдзетныя сем’і (59 з 68 чалавек былі жанатымі, ці 86,8%, сярэдняя колькасць дзяцей у іх сем’ях складала 2–3 дзіцяці). Да прызначэння на губернатарскую пасаду губернатары звычайна мелі значны досвед ваеннай ці грамадзянскай службы, а па сваіх поглядах з’яўляліся шчырымі манархістамі.

**Асабісты ўклад саіскальніка вучонай ступені**

Дысертацыйная праца з’яўляецца вынікам самастойнага аўтарскага даследавання, тэарэтычнай асновай якога стаў мадэрнізацыйны падыход. Значная частка архіўных матэрыялаў, выкарыстаных у працы, упершыню ўводзіцца ў навуковы абарот. На падставе шырокага кола заканадаўчых крыніц, матэрыялаў афіцыйнага справаводства, мемуарыстыкі і літаратуры былі даследаваны асаблівасці губернатарскага корпуса ў Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст.: прававая база функцыянавання; узаемадзеянне ў вертыкалі ўлады; механізм кіравання і кантролю; прынцыпы падбору начальнікаў губерняў і складзены іх сацыяльны партрэт.

Апублікаваныя па тэме дысертацыі 1 артыкул у зборніку навуковых работ і 1 артыкул у зборніку матэрыялаў навуковых канферэнцый напісаны ў суаўтарстве з А.М. Лукашэвічам (50 %).

**Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў**

Вынікі дысертацыйнага даследавання былі апрабаваны на 11 навуковых і навукова-практычных канферэнцыях: IX Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Библиотека в XXI веке: молодежь в науке” (Мінск, 26–27 кастрычніка 2017 г.); Міжнародная навуковая канферэнцыя “1917 год у гістарычных лёсах Беларусі” (Мінск, 30 лістапада – 1 снежня 2017 г.); Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Копытинские чтения – I, II” (Магілёў, 17–18 мая 2018 г.); Міжнародная навуковая канферэнцыя “Фарміраванне беларускай дзяржаўнасці ва ўмовах геапалітычных зрухаў XX ст.” (Мінск, 29–30 лістапада 2018 г.); II Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя “Белорусская государственность: истоки, становление, развитие. IX–XXI вв. (к 100-летию провозглашения БССР)” (Мінск, 21 снежня 2018 г.); Усерасійская навукова-практычная канферэнцыя “Социум и память: проблематика образовательного пространства” (Екацярынбург, 17 мая 2019 г.); Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя студэнтаў, аспірантаў і маладых навукоўцаў “XIII Машеровские чтения” (Віцебск, 18 кастрычніка 2019 г.); Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Беларусь у эпоху геапалітычных і сацыяльных зрухаў Новага і Навейшага часу. Да 25-годдзя кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта” (Мінск, 22 лістапада 2019 г.); III-я Міжнародная навуковая канферэнцыя “«Долгий XIX век» в истории Беларуси и Восточной Европы” (Мінск, 13 снежня 2019 г.); Міжнародная навукова-тэарэтычная канферэнцыя “Пічэтаўскія чытанні – 2021: 100 гадоў БДУ – першаму ўніверсітэту Беларусі” (Мінск, 27–28 кастрычніка 2021 г.); Міжнародная навуковая канферэнцыя “Пічэтаўскія чытанні – 2022: універсітэты і архівы як састаўныя элементы экалогіі культуры” (Мінск, 30 верасня 2022 г.).

Матэрыялы і вывады дысертацыі знайшлі прымяненне ў адукацыйным працэсе на гістарычным факультэце БДУ (маецца 1 акт аб укараненні).

**Апублікаванне вынікаў дысертацыі**

Асноўныя вынікі дысертацыі апублікаваны ў 20 навуковых работах, з якіх 8 – артыкулы ў навуковых выданнях, уключаных ВАК у пералік выданняў для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў (агульны аб’ём 4,6 аўтарскіх аркуша), 2 артыкулы ў зборніках навуковых работ, 10 артыкулаў у зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый.

**Структура і аб’ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з пераліку скарачэнняў і абазначэнняў, уводзін, агульнай характарыстыкі работы, асноўнай часткі, якая ўключае ў сябе 5 глаў,

заключэння, спісу выкарыстаных крыніц і дадаткаў. Агульны аб’ём працы складае 182 старонкі, з іх тры дадаткі займаюць 35 старонак. Спіс выкарыстаных крыніц займае 32 старонкі і налічвае 389 найменняў, з якіх 20 – публікацыі аўтара.

## АСНОЎНАЯ ЧАСТКА

У першай главе **“Гістарыяграфія, крыніцы, метадалогія і метады даследавання”** праводзіцца аналіз гістарыяграфіі і крыніц па тэме дысертацыі, раскрываюцца выкарыстаныя ў працы метады.

У раздзеле ***1.1 “Гістарыяграфія”*** вызначана ступень распрацаванасці праблемы даследавання. Адзначана, што ў айчыннай і замежнай гістарычнай навуцы тэма губернатарскага корпуса на тэрыторыі Беларусі з’яўляецца адной з маладаследаваных. Грунтоўны падмурак для сучасных даследаванняў губернатарскага корпуса быў закладзены ў дарэвалюцыйны час. У *расійскай гістарыяграфіі* канца XIX – пачатку XX ст. аднымі з першых да вывучэння праблем звязаных з развіццём інстытута губернатарства звярнуліся гісторыкі-прававеды А.Я. Градоўскі, І.М. Страхоўскі, В.В. Іваноўскі, М.М. Каркуноў, І.А. Бліноў[1]. Іх працы прысвячаліся пытанням эвалюцыі прававога статусу губернатараў і інш. У сваіх даследаваннях яны прымянялі фармальна-юрыдычны падыход.

У *савецкай гістарычнай навуцы* тэма інстытута губернатарства распрацоўвалася ў кантэксце вывучэння *дзяржаўнага апарату* Расійскай імперыі (М.П. Ярошкін, П.А. Заянчкоўскі, І.В. Аржэхоўскі[2]). Для савецкіх гісторыкаў было характэрным выкарыстанне ведамаснага падыходу адносна пытання губернатарскай улады. У *беларускай гістарыяграфіі* савецкага перыяду пытанні *ўрадавай палітыкі* на тэрыторыі Беларусі даследавалі А.І. Цвікевіч і С.М. Самбук[3]. Але яны больш увагі надавалі дзейнасці генерал-губернатараў, чым губернатараў. У сучаснай беларускай гістарыяграфіі ўзрастае цікавасць да начальнікаў губерняў эпохі Расійскай імперыі. Аўтары звяртаюцца да дзейнасці асобных чыноўнікаў (І.Л. Вернер, П.І. Брыгадзін, А.М. Лукашэвіч, Б.І. Сідарэнка,

---

[1] Градовский А.Д. Реформа губернаторской должности // Собр. соч. А.Д. Градовского: [в 9 т.]. – СПб., 1908. – Т. 9. – С. 563–595; Страховский И.М. Губернское устройство // Журн. М-ва юстиции. – 1913. – № 7–8. – С. 28–92; Ивановский В.В. Административное устройство наших окраин. – Казань: Тип. Императ. ун-та, 1891. – 47 с.; Коркунов Н.М. Русское государственное право: в 2 т. / под ред. и с доп. М.Б. Горенберга. – СПб.: Тип. М.М. Стасюлевича, 1909. – Т. 2. Часть особенная. – 739 с.; Блинов И.А. Губернаторы: ист.-юрид. очерк. – СПб.: Типо-литогр. К.Л. Пентковского, 1905. – 360 с.

[2] Ерошкин Н.П. История государственных учреждений дореволюционной России: учебник. – 3-е изд., перераб. и доп. – М.: Высш. шк., 1983. – 352 с.; Зайончковский П.А. Правительственный аппарат самодержавной России в XIX в. – М.: Мысль, 1978. – 288 с.; Оржеховский И.В. Из истории внутренней политики самодержавия в 60–70-х годах XIX века: лекции по спецкурсу. – Горький: [Горьк. ун-т], 1974. – 168 с.

[3] Цвікевіч А. «Западно-руссизм»: нарысы з гісторыі грамадскай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. / паслясл. А. Ліса. – 2-е выд. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 349 с.; Самбук С.М. Политика царизма в Белоруссии в 60–90-е гг. XIX века / ред. В.П. Панютич. – Минск: Наука и техника, 1980. – 221 с.

В.М. Чарапіца[4]), або факусіруюцца на калектыўных біяграфіях (М.У. Шымукенус, Т.Ю. Афанасьева, Р.Ф. Гарачава, В.В. Швед, Ю.М. Снапкоўскі[5]).

Тэма губернатарства даволі актыўна распрацоўваецца ў *сучаснай расійскай гістарыяграфіі*. Пры вывучэнні гэтай праблематыкі вылучаюцца некалькі новых падыходаў: рэгіянальна-кіраўніцкі (А.В. Рэмнеў), канцэпцыя нефармальных фактараў (Н.П. Матханава), канцэпцыя сістэмнага крызісу (І.С. Разенталь, С.В. Любічанкоўскі), сацыякультурны (Л.М. Лысенка), мадэрнізацыйны падыход (Б.М. Міронаў)[6]. Праблема расійскага інстытута губернатарства знайшла адлюстраванне і ў *замежнай гістарыяграфіі*[7]. У той жа час цалкам корпус губернатараў на тэрыторыі Беларусі за 1864–1917 гг. не аналізаваўся.

Раздзел ***1.2 "Крыніцы"*** прысвечаны аналізу апублікаваных і неапублікаваных матэрыялаў. Адзначаецца, што найбольш значныя масівы дакументаў, якія былі пакладзены ў аснову кандыдацкага даследавання, захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі (ф. 22, 24, 242, 295, 299, 300, 1416, 1430, 2001, 2642), Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Гродна (ф. 1), Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь (ф. 60 п), Расійскім дзяржаўным гістарычным архіве, г. Санкт-Пецярбург (ф. 1263, 1276, 1282, 1284, 1349),

---

[4] Вернер И.Л. На губернаторском посту (о деятельности Павла Яковлевича Ростовцева по управлению Витебской губернией в 1869–1880 гг.) // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. / Нац. гіст. арх. Беларусі. – Мінск, 2007. – Вып. 5. – С. 175–187; Бригадин П.И., Лукашевич А.М. Минские губернаторы: история власти. – Минск: Гос. ин-т упр. и соц. технологий Белорус. гос. ун-та, 2009. – 351 с.; Сидоренко Б.И. Могилевский губернатор Александр Станиславович Дембовецкий и его время. – Могилев: АмелияПринт, 2012. – 250 с.; Черепица В.Н. Город-крепость Гродно в годы Первой мировой войны: мероприятия гражданских и военных властей по обеспечению обороноспособности и жизнедеятельности. – Гродно: ГрГУ, 2006. – 535 с.

[5] Шимукенус М.В. Могилевские губернаторы, 1772–1917 гг. // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. / Нац. гіст. арх. Беларусі. – Мінск, 2008. – Вып. 6. – С. 212–221; Афанасьева Т.Ю., Горячева Р.Ф., Швед В.В. Гродненские губернаторы (1801–1917 гг.): док.-биогр. очерки. – Гродно: Гродн. тип., 2007. – 166 с.; Минские губернаторы, вице-губернаторы и губернские предводители дворянства, 1793–1917: биогр. справ. / Нац. ист. арх. Беларуси; сост. Ю.Н. Снапковский; редкол.: В.И. Адамушко [и др.]. – Минск: Беларусь, 2016. – 398 с.

[6] Ремнев А.В. Самодержавие и Сибирь: административная политика второй половины XIX – начала XX веков. – Омск: Омс. гос. ун-т, 1997. – 252 с.; Матханова Н.П. Высшая администрация Восточной Сибири в середине XIX века (конец 1830-х – середина 1860-х годов): автореф. дис. ... д-ра ист. наук: 07.00.02; Ин-т. ист. СО РАН. – Новосибирск, 1999. – 44 с.; Розенталь И.С. Массовые представления о власти: Москва, начало XX века // Армагеддон: актуальные проблемы истории, философии, культурологи / Ин-т приклад. истории и культурологии, Гос. акад. сферы быта и услуг. – М., 1999. – Кн. 4. – С. 73–76; Любичанковский С.В. Губернская администрация и проблема кризиса власти в позднеимперской России (на материалах Урала, 1892 – 1914 гг.): дис. … д-ра ист. наук: 07.00.02. – СПб., 2008. – 869 л.; Лысенко Л.М. Губернаторы и генерал-губернаторы Российской империи (XVIII – начало XX века). – 2-е изд., испр. и доп. – М.: Прометей, 2001. – 358 с.; Миронов Б.Н. Российская империя: от традиции к модерну: в 3 т. – СПб.: Д. Буланин, 2014–2015. – 3 т.

[7] Robbins R.G. The Tsar's viceroys: Russian provincial governors in the last years of the empire. – Ithaca: Cornell Univ. Press, 1987. – XVI, 271 p.; Wiech S. Litwa i Białoruś. Od Murawjowa do Baranowa (1864–1868). – Kielce: Wydaw. Uniw. Jana Kochanowskiego, 2018. – 333 s. – (Depolonizacja ziem zabranych (1864–1914); t. 1); Chimiak L. Gubernatorzy rosyjscy w Królestwie Polskim, 1863–1915: szkic do portr. zbior. – Wroclaw: Fund. na Rzecz Nauki Pol., 1999. – 358 s.; Шандра В.С. Генерал-губернаторства в Україні: XIX – початок XX століття. – К.: НАН України. Ін-т історії України, 2005. – 427 с.

Аддзеле рукапісаў Расійскай нацыянальнай бібліятэкі, г. Санкт-Пецярбург (ф. 16, 127). У дысертацыі былі выкарыстаны розныя віды *пісьмовых крыніц*: дакументы заканадаўства (законы, палажэнні, указы і інш.); матэрыялы справаводства (штогадовыя справаздачы, цыркуляры, інструкцыі, запіскі і інш.); статыстычныя матэрыялы (адрас-календары, спісы генералам па старшынстве, спісы грамадзянскіх чыноў і інш.); крыніцы асабістага паходжання (прыватная перапіска, успаміны, дзённікі). Крыніцы, якія выкарыстоўваліся ў працэсе даследавання, дазваляюць раскрыць асаблівасці функцыянавання корпуса губернатараў на тэрыторыі Беларусі ў 1864–1917 гг. і скласці іх сацыяльны партрэт.

У раздзеле ***1.3 “Метадалогія і метады даследавання”*** разглядаюцца метадалагічныя падыходы, якія прымяняліся ў працы. У аснову дысертацыі былі пакладзены прынцыпы гістарычнага даследавання: аб’ектыўнасць, гістарызм, сістэмнасць. У ёй былі выкарыстаны *агульнанавуковыя, спецыяльна-гістарычныя, прасапаграфічны*, а таксама *колькасныя* метады даследавання.

У другой главе **“Прававая аснова функцыянавання губернатарскага корпуса”** раскрываецца нарматыўная база, на падставе якой функцыянаваў корпус губернатараў.

У раздзеле ***2.1 “Эвалюцыя службовых функцый і паўнамоцтваў у мірны час”*** вылучаецца пяць груп функцый губернатара. Адзначаецца, што ў начальнікаў беларускіх губерняў даўжэй, у параўнанні з цэнтральнымі расійскімі губернямі, захоўваліся моцныя сацыяльныя, гаспадарчыя і кантрольна-паліцэйскія функцыі. У адносінах да неправаслаўных канфесій губернатар меў адміністрацыйныя рычагі кантролю, у той жа час праваслаўнай царкве аказвалася заступніцтва.

У раздзеле ***2.2 “Функцыянаванне корпуса губернатараў падчас рэвалюцыі 1905–1907 гг.”*** аналізуюцца змены ў губернатарскіх функцыях у час рэвалюцыйных падзей. Высвятляецца, што ва ўмовах рэвалюцыі 1905–1907 гг. паўнамоцтвы губернатараў заканадаўча пашыраліся. Але выключныя меры, накіраваныя на падтрымку грамадскага парадку, часта прыводзілі да гвалту над насельніцтвам. У якасці зваротнай рэакцыі, губернатары нярэдка і самі станавіліся ахвярамі гвалту з боку радыкальных дзеячаў і арганізацый.

У раздзеле ***2.3 “Паўнамоцтвы кіраўнікоў губерняў у гады Першай сусветнай вайны”*** вызначаюцца асаблівасці функцыянавання губернатарскага корпуса ў ваенных умовах. Адзначаецца, што падчас Першай сусветнай вайны губернатары падпарадкоўваліся, акрамя міністра ўнутраных спраў, ваенным начальнікам, прычым кантакты з апошнімі мелі больш істотнае значэнне. Губернатар выступаў пасрэднікам у ажыццяўленні зносін паміж ваенным начальствам і грамадзянскім насельніцтвам.

У трэцяй главе **“Узаемаадносіны ў сістэме вертыкалі ўлады”** раскрываюцца службовыя адносіны губернатара з міністрам унутраных спраў, генерал-губернатарам і віцэ-губернатарам.

Раздзел ***3.1 “Стасункі з міністрам унутраных спраў”*** прысвечаны ўзаемасувязям губернатара з кіраўніком МУС. Вызначана, што яны праяўляліся ў наступных аспектах: прызначэнне на пасаду і звальненне ад яе, кадравая палітыка ў губерні, справаздачная дакументацыя. Праз усе з іх ажыццяўляўся кантроль губернатарскай дзейнасці.

У раздзеле ***3.2 “Адносіны з генерал-губернатарам”*** разглядаюцца сувязі начальніка губерні і кіраўніка Віленскага генерал-губернатарства. Адзначаецца, што прызначэнне і звальненне ўсіх службовых асоб, у тым ліку і самога губернатара, залежала ад генерал-губернатара. Губернатары павінны былі выконваць усе законныя прапановы і прадпісанні генерал-губернатара, які выступаў каардынуючым і наглядным органам для начальнікаў падуладных яму губерняў.

У раздзеле ***3.3 “Сувязі з віцэ-губернатарам”*** характарызуюцца афіцыйныя зносіны губернатара і яго бліжэйшага памочніка. Заканадаўства падпарадкоўвала віцэ-губернатара непасрэдна начальніку губерні і аб’яўляла ягоным памочнікам. Падчас адсутнасці губернатара, яго замяшчаў у першую чаргу віцэ-губернатар. З канца 1915 г. у сферы кіраўніцтва губерняй на віцэ-губернатараў ускладалася загадванне бягучымі справамі.

У чацвёртай главе **“Механізм губернатарскага кіравання і кантролю”** вызначаюцца адметнасці сістэмы кіравання і кантролю губернатара ў Беларусі.

У раздзеле ***4.1 “Адміністрацыйнае кіраванне”*** удакладняецца механізм кіравання губернатара. Адзначаецца, што ён заключаўся ў наглядзе за адміністрацыйнымі ўстановамі грамадзянскага ведамства, рэвізіі прысутных месцаў, вырашэнні кадравых пытанняў і інш. Губернатар ажыццяўляў кантроль з дапамогай службовых асоб і ўстаноў, якія ад яго залежалі. У Беларусі, да ўвядзення земскіх устаноў, губернатар захоўваў бо́льшы ўплыў на кіраванне (у эканамічнай і сацыяльнай галінах), чым у земскіх губернях.

У раздзеле ***4.2 “Нагляд за губернскімі ўстановамі іншых ведамстваў”*** акцэнтуецца ўвага на тых установах, якія не падпарадкоўваліся губернатару, але за якімі ён ажыццяўляў назіранне. Падкрэсліваецца, што губернатар у Беларусі ўмешваўся ў судовую сферу даўжэй, чым у цэнтральных расійскіх губернях. У справах кантролю за казёнымі палатамі і ўпраўленнем дзяржаўных маёмасцяў губернатарскі ўдзел заключаўся ў наглядзе, паведамленні заўваг гэтым упраўленням і вышэйшаму начальству, а таксама (за выключэннем кантрольных палат) правядзенні рэвізій.

У раздзеле ***4.3 “Кантроль за самакіраваннем і канфесіянальнымі структурамі”*** разглядаюцца губернатарскі нагляд за дваранскім, сялянскім, гарадскім і земскім самакіраваннем, адносіны да канфесій. Адзначаецца, што ў беларускіх губернях кіраўніцтва дваранскага самакіравання прызначалася па прапанове губернатара. Таму неабходнасць у кантролі начальніка губерні тут зменшылася. Нагляд губернатара за парэформенным самакіраваннем ажыццяўляўся праз

старшынства ў губернскіх установах, рэвізіі органаў самакіравання, спыненне выканання іх асобных пастаноў. Губернатар спрыяў дзейнасці праваслаўнай царквы, але не меў кантролю над ёй. Ён наглядаў за іншымі канфесіямі праз адміністрацыйныя працэдуры.

У пятай главе **“Сацыяльны партрэт губернатараў”** вызначаюцца асаблівасці падбору, прызначэння і звальнення начальнікаў беларускіх губерняў і складзены іх агульны сацыяльны партрэт.

У раздзеле ***5.1 “Прынцыпы падбору, прызначэння і звальнення губернатараў”*** раскрываюцца прычыны і абставіны, якія ўплывалі на фарміраванне губернатарскага корпуса ў Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Указваецца, што пры прызначэнні начальнікам губерні ўлічваліся як дзелавыя здольнасці кандыдата і яго асабістыя характарыстыкі, так і ўплыў іншых асоб. Ад губернатарскай пасады вызвалялі па розных прычынах, у т. л. за злоўжыванні. Пасля паўстання 1863–1864 гг. пры камплектаванні губернатарскага корпуса перавага аддавалася чыноўнікам праваслаўнага ці лютэранскага веравызнання.

У раздзеле ***5.2 “Сацыяльныя характарыстыкі губернатараў”*** складзены калектыўны партрэт начальнікаў беларускіх губерняў за 1864–1917 гг. Праведзены прасапаграфічны аналіз дазволіў скласці наступны *абагульнены сацыяльны партрэт губернатара*. Гэта адукаваны, вопытны службовец, з сям’ёй. Спадчынны дваранін, паходзіў з унутраных расійскіх губерняў. Па веравызнанні праваслаўны, землеўладальнік. На губернатарскую пасаду прызначаны ва ўзросце 45 гадоў, у чыне IV класа і прабыў на ёй чатыры гады.

У раздзеле ***5.3 “Параўнальны аналіз”*** супастаўляюцца абагульненыя сацыяльныя партрэты губернатараў цэнтральнай Беларусі (мінскіх) з – заходнімі (віленскімі і гродзенскімі) і ўсходнімі (віцебскімі і магілёўскімі). Адзначаецца, што корпусы начальнікаў трох рэгіёнаў мелі паміж сабой пэўныя адрозненні.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. У 1864–1917 гг. губернатары з’яўляліся кіраўнікамі губернскай адміністрацыі і галоўнымі прадстаўнікамі вярхоўнай улады на месцах, таму з імі вымушаны былі лічыцца, як начальнікі іншых ведамстваў, так і органы мясцовага самакіравання. Наяўнасць Віленскага генерал-губернатарства (да 1912 г.), адметнасці ў правядзенні рэформаў 1860–1870-х і “контррэформаў” 1880-х – пачатку 1890-х гг., існаванне моцных “польскіх уплываў” на тэрыторыі Беларусі, – прадвызначылі асаблівасці функцыянавання тут губернатараў.

Губернатарскі корпус на тэрыторыі Беларусі ў 1864–1917 гг. складаў частку агульнарасійскага інстытута губернатарства, але разам з тым для яго былі

характэрныя пэўныя асаблівасці. Гэта знайшло адлюстраванне як у заканадаўстве, так і на практыцы. У сувязі з блізкасцю рэгіёна да мяжы, начальнікі беларускіх губерняў мелі меншую свабоду дзеянняў (наяўнасць генерал-губернатарства), але валодалі большым наборам функцый (пераважна ў гаспадарчай і сацыяльнай сферах). Правядзенне з пэўным спазненнем і абмежаваннем рэформаў 60–70-х гг. XIX ст. не прывяло да поўнага ўмацавання мясцовых органаў самакіравання – яны засталіся пад моцным уплывам губернатараў.

Новыя судовыя ўстановы (у Беларусі з 1872 г.) і органы гарадскога самакіравання (з 1875 г.) стваралiся са спазненнем і губернатары маглі ўплываць на кадравыя прызначэнні ў судовай сферы. У 1864–1903 гг. у трох беларускіх губернях (а ў Віленскай і Гродзенскай, дзе земствы не ўводзіліся, – да канца існавання губернатарскай улады) і ў 1864–1875 гг. у беларускіх гарадах (да ўвядзення ў 1875 г. Гарадавога палажэння), гаспадарчыя і сацыяльныя функцыі ажыццяўляў губернатар. У той жа час у цэнтральных губернях Расійскай імперыі гэтыя функцыі перакладаліся на земскае (з 1864 г.) і гарадское (з 1870 г.) самакіраванне. Таму губернатары ў Беларусі мелі больш паўнамоцтваў (у сацыяльнай і гаспадарчай сферах), чым ва ўнутраных губернях Расіі [1–3; 6].

2. У надзвычайных умовах (рэвалюцыйныя, ваенныя падзеі) паўнамоцтвы губернатараў значна пашыраліся за кошт паліцэйска-кантрольных функцый. Яны атрымлівалі права выдаваць абавязковыя пастановы (на забарону сходаў і інш.); аб'яўляць становішча ўзмоцненай або надзвычайнай аховы і ўжываць надзвычайныя меры на падкантрольнай ім тэрыторыі ў асобных выпадках; мелі права ўмяшання ў судовую сістэму; зацвярджэння размеркавання выбаршчыкаў; дазволу на заснаванне таварыстваў ці саюзаў. Найбольш выразна гэта выявілася падчас расійскай рэвалюцыі 1905–1907 гг. і ў гады Першай сусветнай вайны. Неўзабаве выключныя меры, накіраваныя на падтрымку грамадскага парадку, маглі прыводзіць да гвалту над насельніцтвам, і трагедый падобна "Курлаўскаму расстрэлу". У якасці зваротнай рэакцыі, губернатары нярэдка і самі станавіліся ахвярамі гвалту з боку радыкальна настроеных дзеячаў і арганізацый. Гэта вяло да ўзмацнення ратацыі кадраў: за перыяд рэвалюцыі 1905–1907 гг. у беларускіх губернях змянілася 12 губернатараў. Такія частыя кадравыя змены тлумачацца замахамі на высокапастаўленых чыноўнікаў, у т. л. на мінскага губернатара П.Р. Курлава, магілёўскага – М.М. Клінгенберга і віленскага – графа К.К. Палена.

У гады Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі зноў уводзілася ваеннае становішча. Таму губернатары падпарадкоўваліся, акрамя міністра ўнутраных спраў, яшчэ і галоўным начальнікам ваенных акруг на тэатры ваенных дзеянняў (1914–1915 гг.) і начальнікам забеспячэння франтоў (1915–1917 гг.). Прычым кантакты з апошнімі мелі больш істотнае значэнне. Таксама губернатар выступаў сувязным звяном у ажыццяўленні зносін паміж ваенным начальствам і

грамадзянскім насельніцтвам. У крайняй неабходнасці начальнікі губерняў у сваім кіраванні выкарыстоўвалі надзвычайныя паўнамоцтвы вайскоўцаў. Са згоды ваеннага кіраўніцтва яны маглі ссылаць злачынцаў за межы губерні, што яшчэ больш узмацняла кантроль над жыхарамі з боку адміністрацыі [4; 9; 14].

3. Пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. на тэрыторыі Беларусі да 1868–1871 гг. захоўвалася ваеннае становішча. Таму губернатары былі падначалены віленскаму генерал-губернатару. У іерархіі ўлады апошні займаў вышэйшую пасаду і падпарадкоўваўся непасрэдна імператару. Аднак у 1869 г. Магілёўская і Віцебская, а ў 1870 г. Мінская губ. былі выведзены з-пад кантролю генерал-губернатара. Пры гэтым у Гродзенскай і Віленскай (разам з Ковенскай) губ. інстытут генерал-губернатарства захоўваўся да 1912 г. Непасрэдным начальнікам для губернатара заставаўся міністр унутраных спраў, а кантакты з імператарам былі зведзены да мінімуму. Пасля зняцця ваеннага становішча губернатары атрымалі больш самастойнасці ў сваіх губернях, што праяўлялася праз іх ініцыятывы ў сферах, якія не закраналі асноў існуючага рэжыму. Тым не менш любое важнае рашэнне патрабавала ўзгаднення з МУС. Таму адносна насельніцтва губерні і падначаленых устаноў губернатар з’яўляўся поўнаўладным начальнікам, але на самай справе яго ўлада была абмежавана міністэрствам.

Службовыя зносіны губернатара з генерал-губернатарам і міністрам унутраных спраў вызначаліся праз механізм падбору і звальнення губернатара, ва ўзгадненні кадравай палітыкі ў губерні, пры стварэнні і прадстаўленні справаздачнай дакументацыі. Праз усе гэтыя кірункі праяўляўся кантроль за дзейнасцю начальніка губерні. Акрамя таго, нават атрыманне губернатарам матэрыяльнай дапамогі ці адпачынку залежала ад міністра.

Адносіны губернатара з віцэ-губернатарам вар’іраваліся ад даверлівых і канструктыўных да супрацьстаяння. У сітуацыях калі працаваць разам не ўдавалася – адзін з іх імкнуўся перавесціся сам ці накіраваць свайго саслужыўца ў іншую губерню. Змена асобы на пасту начальніка губерні ці яго намесніка нярэдка стварала і іншую мадэль зносін. Заканадаўства падпарадкоўвала віцэ-губернатара непасрэдна губернатару і замацоўвала ягоным памочнікам. Аднак у рэчаіснасці дапамога была не заўсёды. У перыяд адсутнасці начальніка губерні, яго замяшчаў галоўным чынам віцэ-губернатар. З канца 1915 г. за губернатарамі пакідалася агульнае кіраўніцтва губерняй, а на віцэ-губернатараў ускладалася загадванне штодзённымі справамі.

Сістэма кіравання ў беларускіх губернях была даволі складанай. У Віленскай і Гродзенскай губ. (да 1912 г.) структура налічвала чатыры ступені (імператар – МУС – генерал-губернатар – губернатар). У той жа час у Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай губ. існавала трохузроўневая (імператар – МУС – губернатар, з 1869–1870 гг.). Гэта і стварала адрозненні паміж заходнімі і цэнтральна-ўсходнімі беларускімі тэрыторыямі. У першых захоўваўся больш шчыльны

дзяржаўны кантроль, у тым ліку за губернатарамі, а ў другіх – яны мелі больш свабоды дзеянняў.

Імператар, генерал-губернатар і МУС інфармаваліся ў значнай ступені праз губернатарскую штогадовую справаздачу. Тым самым праз прапановы губернатараў у справаздачных дакументах праяўлялася іх самастойнасць і ўплыў на прыняцце рашэнняў уладамі вышэйшага ўзроўню. Але гэта не азначала, што губернатары маглі праводзіць уласную палітыку ў губерні, наадварот яны павінны былі рэалізоўваць на месцах мерапрыемствы цэнтра [4; 6; 7; 10; 14; 19].

4. Механізм адміністрацыйнага кіравання губернатара ўключаў нагляд за губернскімі ўстановамі грамадзянскага ведамства, праверкі прысутных месцаў (выяўленыя няспраўнасці прадпісваў выпраўляць). У руках начальніка губерні знаходзілася вырашэнне пытанняў з кадрамі. З аднаго боку, ён распараджаўся аб прыцягненні да адказнасці вінаватых у злоўжываннях чыноўнікаў, а з другога – узнагароджваў іх за заслугі на службе. Таксама губернатар сачыў за правільным вырашэннем спраў у губернскім праўленні, патрабаваў ад падведамасных установ справаздачнасці, назіраў за зборам статыстычных дадзеных.

У кіраванні эканамічнай сферай (збор і расходаванне падаткаў, будаўніцтва, фабрычная вытворчасць, межаванне, гандаль, лясная гаспадарка) нагляд ажыццяўляўся пры дапамозе ўстаноў, дзе губернатар займаў пасаду старшыні, ці праз службовыя асобы і органы, якія ад яго залежалі. У Беларусі губернатар меў бо́льшы кантроль па лясной гаспадарцы, па частцы падаткаабкладання (некаторыя члены губернскіх устаноў замяняліся асобамі па распараджэнні і прадстаўленні, ці прызначэнні губернатара), у сувязі з пазнейшым увядзеннем земскіх органаў і толькі ў трох губернях. У справах кіравання казённых палат і ўпраўлення дзяржаўных маёмасцяў губернатар удзельнічаў праз нагляд (заўвагі паведамляў гэтым упраўленням і вышэйшаму начальству), а таксама (за выключэннем кантрольных палат) праз правядзенне рэвізій.

У сацыяльнай галіне (ахова здароўя, грамадская апека, забеспячэнне харчаваннем, народная адукацыя) начальнік губерні займаў уплывовую пазіцыю. Ён старшынстваваў або ўваходзіў у склад кіраўніцтва многіх папячыцельных установ, ці яны залежалі ад губернскага праўлення (дзе начальнік губерні з’яўляўся старшынёй). Губернатар валодаў правам зацвярджэння статутаў гарадскіх папячыцельстваў аб бедных у губернскіх гарадах (з 1903 г.) і дабрачынных таварыстваў (з 1911 г.). Акрамя таго, ён прызначаў кіраўнікоў, удзельнічаў у падборы кадраў некаторых навучальных устаноў. У Беларусі ўдзел губернатара ў сацыяльнай апецы захоўваўся ў бо́льшай ступені і больш працяглы час (праз існаванне прыказаў грамадскай апекі да пачатку XX ст., дзе ён старшынстваваў), у параўнанні з земскімі губернямі.

Судовыя статуты 1864 г. уводзіліся ў беларускіх губернях з 1872 г. І толькі з канца 1883 г. з'яднаныя дарэформенныя палаты грамадзянскага і крымінальнага суда скасоўваліся, а прававы нагляд начальніка губерні спыняўся. Таму ў Беларусі губернатар умешваўся ў судовыя справы больш працяглы тэрмін, чым ва ўнутраных расійскіх губернях [1–3; 10; 12; 14; 18].

5. У адносінах да самакіравання дваран, кіраўніцтва якога ў Беларусі прызначалася ад урада (па прадстаўленні начальніка губерні і міністра ўнутраных спраў), нагляд губернатара аслаб, у адрозненне ад цэнтральных расійскіх губерняў, дзе дваранскія выбары існавалі.

Кантроль за сялянскім самакіраваннем ажыццяўляўся ў Беларусі губернатарам праз старшынства ў губернскай па сялянскіх справах прысутнасці (губернскай прысутнасці); праверкі валаснога кіравання і справаводства ўстаноў па сялянскіх справах; праз спыненне выканання пастаноў губернскай прысутнасці (з паведамленнем у МУС); звальненне з пасад службовых асоб валаснога і сельскага кіравання з-за парушэння імі сваіх абавязкаў (па законе ад 12 ліпеня 1889 г., уводзіўся ў Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай губ. – з 1901 г., у Віленскай і Гродзенскай – з 1903 г.). Аднак адхіленне з пасады валаснога старшыны вырашалася ўжо на пасяджэнні губернскай прысутнасці. Мясцовыя органы кіравання, праз якія губернатар ажыццяўляў кантроль за самакіраваннем у беларускіх вёсках, камплектаваліся пераважна праз прызначэнні міністра ўнутраных спраў, генерал-губернатара і з удзелам губернатара (ва ўнутраных расійскіх губернях яны мелі частковую выбарнасць). Таму ў Беларусі ў механізме нагляду за сялянскім грамадскім кіраваннем начальніку губерні надавалася больш уплывовая роля.

Пасля рэформы 1870 г. (у Беларусі здзяйснялася з 1875 г.) гарадское самакіраванне знаходзілася пад няспынным кантролем начальніка губерні (дарэформеннай гарадской думе губернатар рабіў прадпісанні). У гэтым яму аказвала неацэнную падтрымку губернская па гарадскіх (з 1892 г., пры наяўнасці земстваў – па земскіх і гарадскіх) справах прысутнасць. Пастановы гарадской думы набывалі сілу толькі пасля губернатарскай праверкі на адпаведнасць законам. Абраныя кіраўнікі гарадоў (за выключэннем губернскіх) зацвярджаліся на пасадзе начальнікам губерні (у Беларусі, калі абраная кандыдатура выклікала ў губернатара сумненне – кіраўніком МУС). А з 1892 г. нагляд губернатара стаў яшчэ больш шчыльным (кантраляваў як законнасць дзеянняў гарадскога самакіравання, так і іх правільнасць, мог спыняць у акрэсленых выпадках выкананне пастаноў думы).

Губернатар ажыццяўляў кантроль над выбарнымі земскімі ўстановамі (праз губернскую па земскіх і гарадскіх справах прысутнасць, у якой старшынстваваў; нагляд за законнасцю і правільнасцю іх дзейнасці; зацвярджэнне на выбарныя пасады; праз зацвярджэнне ці спыненне выканання асобных пастаноў земстваў; хадайніцтвы аб мясцовых патрэбах губернскага земскага

сходу ва ўрад; праверкі падначаленых земству ўстаноў). Пры гэтым у Віленскай і Гродзенскай губ. земскія ўстановы не ўводзіліся.

Губернатар не меў кантролю за праваслаўнай царквой, але падтрымліваў яе дзейнасць. У той жа час ён кантраляваў неправаслаўныя канфесіі праз адміністрацыйныя інструменты (дазвол на адкрыццё малітоўнай установы, пасрэдніцтва пры пераходзе з праваслаўя ў іншую канфесію). Пры гэтым у Беларусі пад пільную ўвага губернатара трапляў каталіцкі касцёл, у параўнанні з цэнтральнымі расійскімі губернямі [2; 3; 5; 8].

6. На працягу 1864–1917 гг. губернатары, па прадстаўленні міністра ўнутраных спраў, прызначаліся і звальняліся з пасад імператарам. Звычайна начальнікам губерні станавіліся, прайшоўшы тры этапы: кандыдацтва, знаходжанне на пасадзе і зацвярджэнне. Крытэрыі па якіх адбіраліся прэтэндэнты на пасаду кіраўніка губерні не вызначаліся ў заканадаўстве. Таму ва ўлік браліся дзелавыя здольнасці кандыдата і яго індывідуальныя характарыстыкі (службовы досвед, адукацыя, паходжанне, веравызнанне), і наяўнасць уплывовых заступнікаў (сваяцкія сувязі, службовыя кантакты, пратэкцыя). Прытым той фактар, які ў аднаго чалавека станавіўся рашаючым, у іншага – мог не граць істотнай ролі.

Да звальнення ад губернатарскай пасады прыводзіў шэраг прычын: выяўленыя злоўжыванні, змена ўрадавага курсу ў рэгіёне, крызісныя з’явы, стан здароўя. Часцей службоўца працягваў працу ў іншым рэгіёне ці ішоў на павышэнне (нават пачэснае), ці хаця б прылічаўся да МУС.

У беларускіх губернях, у часы падпарадкавання главе Віленскага генерал-губернатарства, акрамя міністра ўнутраных спраў, значны ўплыў пры перастаноўках губернатараў аказваў і генерал-губернатар. У выніку рэакцыі на паўстанне 1863–1864 гг. губернатарскі корпус пачаў фарміравацца пераважна з асоб праваслаўнага ці лютэранскага веравызнання. Больш за тое, досвед працы з каталіцкім і яўрэйскім насельніцтвам не быў галоўным у прызначэннях на губернатарскія пасады ў Беларусі. Увогуле, эфектыўнасць кіравання ў краі залежала ад прадуманай кадравай палітыкі.

Такім чынам, праведзены аналіз дазваляе скласці наступны абагульнены сацыяльны партрэт начальніка беларускіх губерняў. Гэта чыноўнік, які паходзіў са спадчыннага дваранскага роду, ураджэнец адной з унутраных расійскіх губерняў, праваслаўнага веравызнання, землеўладальнік (сярэдні памер уладанняў складаў 1912,65 дзес.). Атрымаў вышэйшую або сярэднюю спецыяльную (свецкую ці ваенную) адукацыю. Меў абавязковы вопыт грамадзянскай ці ваеннай службы. На губернатарскую пасаду прызначаны ва ўзросце 45 гадоў і ў чыне сапраўднага стацкага саветніка (IV класа). Чалавек сямейны, меў 3 дзяцей. Прабыў на губернатарскай пасадзе ў Беларусі 4 гады і пакінуў яе ў чыне IV класа. У далейшым працягваў службу па грамадзянскаму ведамству і даслужыўся да чына III класа [6; 11–13; 15–17; 20].

## Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў

Вынікі дысертацыйнага даследавання могуць паслужыць метадалагічнай і факталагічнай асновай пры правядзенні новых даследаванняў па праблемах айчыннай гісторыі, рэгіянальнай сістэмы кіравання, кадравай і саслоўнай палітыцы другой паловы XIX – пачатку XX ст. Палажэнні і высновы дысертацыі могуць быць цікавымі пры праектаванні рэформаў дзяржаўных інстытутаў улады, узаемаадносін цэнтральнага і мясцовага кіравання і самакіравання, рэалізацыі кадравай палітыкі. Матэрыялы працы могуць выкарыстоўвацца ў навучальным працэсе агульнаадукацыйных і вышэйшых навучальных устаноў. Да іх можна звяртацца пры стварэнні музейных экспазіцый, выстаў, пры падрыхтоўцы навукова-папулярных твораў, мастацкіх і дакументальных кінастужак. Вынікі дысертацыі выкарыстаны ў адукацыйным працэсе на гістарычным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (маецца 1 акт аб укараненні).

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА ВУЧОНАЙ СТУПЕНІ

Артыкулы, якія ўваходзяць у пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь, зацверджаных ВАК


1. Ляпешкін Я.М. Эвалюцыя службовых функцый і паўнамоцтваў беларускіх губернатараў у час рэформаў 1860–1870-х гг. // Науч. тр. Респ. ин-та высш. шк. Сер.: Ист. и психол.-пед. науки / Респ. ин-т высш. шк. – Минск, 2018. – Вып. 18, ч. 1. – С. 278–283.

2. Ляпешкін Я.М. Дзейнасць губернатараў у сферы развіцця адукацыі і культуры беларускіх губерняў у 1864–1914 гг. // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуманитар. науки. – 2019. – № 9. – С. 26–33.

3. Ляпешкін Я.М. Дзейнасць губернатараў па сацыяльна-эканамічным развіцці беларускіх губерняў у 1864–1914 гг. // Ученые записки УО «ВГУ им. П.М. Машерова»: сб. науч. тр. – Витебск, 2019. – Т. 29. – С. 33–40.

4. Ляпешкін Я.М. Інстытут губернатарства ва ўмовах рэвалюцыі 1905–1907 гг. (на прыкладзе беларускіх губерняў) // Науч. тр. Респ. ин-та высш. шк. Сер.: Ист. и психол.-пед. науки / Респ. ин-т высш. шк. – Минск, 2019. – Вып. 19, ч. 1. – С. 307–316.

5. Ляпешкін Я.М. Мерапрыемствы губернатараў па кантролю за рымска-каталіцкім касцёлам і духавенствам у беларускіх губернях у 1864–1914 гг. // Науч. тр. Респ. ин-та высш. шк. Сер.: Ист. и психол.-пед. науки / Респ. ин-т высш. шк. – Минск, 2021. – Вып. 21, ч. 1. – С. 329–339.

6. Ляпешкін Я.М. Узаемаадносіны начальнікаў беларускіх губерняў з віленскім генерал-губернатарам у 1864–1912 гг. // «Долгий XIX век» в истории Беларуси и Восточной Европы: исследования по Новой и Новейшей истории: сб. науч. тр. / Респ. ин-т высш. шк. – Минск, 2022. – Вып. 6. – С. 197–203.

7. Ляпешкін Я.М. Узаемасувязі губернатара з віцэ-губернатарам у Беларусі (1864–1917 гг.) // Науч. тр. Респ. ин-та высш. шк. Сер.: Ист. и психол.-пед. науки / Респ. ин-т высш. шк. – Минск, 2022. – Вып. 22, ч. 1. – С. 355–364.

8. Ляпешкін Я.М. Кантроль губернатараў за сялянскім самакіраваннем у Беларусі (1864–1917 гг.) // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. – 2023. – № 1 (269). – С. 16–21.


Артыкулы ў зборніках навуковых прац


9. Лепешкин Е.Н., Лукашевич А.М. Функционирование института губернаторства в чрезвычайных условиях в 1881–1917 гг. (на примере Минской губернии) // Вестник военно-исторических исследований: сб. науч. тр. / Пенз. гос. ун-т. – Пенза, 2018. – Вып. 9. – С. 85–93.

10. Ляпешкін Я.М. Службовыя паездкі мінскага губернатара А.Ф. Гірса і парадак яго замяшчэння (1912–1915 гг.) // «Долгий XIX век» в истории Беларуси и Восточной Европы: исследования по Новой и Новейшей истории: сб. науч. тр. / Респ. ин-т высш. шк. – Минск, 2019. – Вып. 3. – С. 62–73.

Артыкулы ў зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый

11. Ляпешкін Я.М. У.А. Друцкой-Сакалінскі – апошні мінскі губернатар // 1917 год у гістарычных лёсах Беларусі: зб. матэрыялаў Міжнар. навук. канф., Мінск, 30 лістап. – 1 снеж. 2017 г. / Беларус. дзярж. ун-т; рэдкал.: А.Д. Кароль (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2017. – С. 237–239.

12. Ляпешкін Я.Н. Дзейнасць М.М. Трубяцкога на пасадзе мінскага губернатара (1886–1902 гг.) [Электронный ресурс] // Библиотека в XXI веке: молодежь в науке: материалы IX Междунар. науч.-практ. конф. молодых ученых и специалистов, Минск, 26–27 окт. 2017 г. / НАН Беларуси, Центр. науч. б-ка; редкол.: Л.А. Авгуль, А.И. Груша (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2018. – С. 89–91. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM).

13. Ляпешкін Я.М. Аналіз складу магілёўскіх губернатараў (1864–1917 гг.) // Копытинские чтения – I, II: сб. ст. Междунар. науч.-практ. конф., Могилев, 17–18 мая 2018 г. / Могилев. гос. ун-т; под общ. ред. М.И. Матюшевской. – Могилев, 2018. – С. 95–97.

14. Ляпешкін Я.М. Мінскія губернатары: кіраванне ў гады Першай сусветнай вайны // Фарміраванне беларускай дзяржаўнасці ва ўмовах геапалітычных зрухаў XX ст.: матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 29–30 лістап. 2018 г. / Беларус. дзярж. ун-т; рэдкал.: А.Д. Кароль (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2018. – С. 194–196.

15. Ляпешкін Я.М. Службовыя дадзеныя губернатараў у памятных кніжках беларускіх губерняў другой паловы XIX – пачатку XX ст. // Белорусская государственность: истоки, становление, развитие. IX–XXI вв. (к 100-летию провозглашения БССР): материалы II Респ. науч.-практ. конф., Минск, 21 дек. 2018 г. / Белорус. гос. пед. ун-т; редкол.: А.В. Касович (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2019. – С. 63–64.

16. Лепешкин Е.Н., Лукашевич А.М. Виленские губернаторы (1864–1917 гг.): конструирование исторических мифов и реальность // Запад, Восток и Россия. Социум и память: вопросы всеобщей истории: сб. науч. и учеб.-метод. тр. / Урал. гос. пед. ун-т. – Екатеринбург, 2019. – Вып. 22: [доклады и сообщения Всерос. науч.-практич. конф. «Социум и память: проблематика образовательного пространства», г. Екатеринбург, 17 мая 2019 г.]. – С. 131–151.

17. Ляпешкін Я.М. Віцебскія губернатары: сацыякультурная характарыстыка (1864–1917 гг.) // XIII Машеровские чтения: материалы междунар.

науч.-практ. конф. студентов, аспирантов и молодых ученых, Витебск, 18 окт. 2019 г. / Витеб. гос. ун-т; редкол.: И.М. Прищепа (гл. ред.) [и др.]. – Витебск, 2019. – С. 129–132.

18. Ляпешкін Я.М. Губернатары і асвета ў Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. // Беларусь у эпоху геапалітычных і сацыяльных зрухаў Новага і Навейшага часу. Да 25-годдзя кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта: матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 22 лістап. 2019 г. / Беларус. дзярж. ун-т; рэдкал.: А.Г. Каханоўскі (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2019. – С. 135–139.

19. Ляпешкін Я.М. Стасункі губернатараў беларускіх губерняў з міністрам унутраных спраў Расійскай імперыі ў 1864–1914 гг. // Пічэтаўскія чытанні – 2021: 100 гадоў БДУ – першаму ўніверсітэту Беларусі: матэрыялы міжнар. навук.-тэарэтыч. канф., Мінск, 27–28 кастр. 2021 г. / Беларус. дзярж. ун-т; рэдкал.: А.Д. Кароль (гал. рэд.) [і інш.]; навук. рэд. М.Ф. Шумейка, А.А. Яноўскі. – Мінск, 2021. – С. 441–450.

20. Ляпешкін Я.М. Прынцыпы фарміравання губернатарскага корпуса на тэрыторыі Беларусі ў 1864–1917 гг. // Пічэтаўскія чытанні – 2022: універсітэты і архівы як састаўныя элементы экалогіі культуры: матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 30 верас. 2022 г. / Беларус. дзярж. ун-т; рэдкал.: А.Г. Каханоўскі (гал. рэд.) [і інш.]; навук. рэд. М.Ф. Шумейка, А.А. Яноўскі. – Мінск, 2022. – С. 353–364.

# РЭЗЮМЭ

**Ляпешкін Яўген Мікалаевіч**
**Губернатарскі корпус у Беларусі (1864 – люты 1917 г.)**

*Ключавыя словы*: губернатар, беларускія губерні, функцыі, віленскі генерал-губернатар, міністр унутраных спраў, віцэ-губернатар, адміністрацыйнае кіраванне, кантроль, самакіраванне, канфесіі, сацыяльны партрэт

*Мэта даследавання*: выяўленне асаблівасцей функцыянавання губернатарскага корпуса і яго кадравага складу ў Беларусі ў 1864 – лютым 1917 г.

*Метады даследавання*: у працы выкарыстаны агульнанавуковыя (аналіз, сінтэз, індукцыя, дэдукцыя, параўнанне, аналогія, абагульненне), спецыяльна-гістарычныя (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-сістэмны), прасапаграфічны, а таксама колькасныя (групоўка, вызначэнне сярэдняй арыфметычнай, вылічэнне) метады даследавання.

*Атрыманыя вынікі і іх навізна*: комплексна даследаваны асаблівасці губернатарскага корпуса ў Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. Прасочана эвалюцыя функцый губернатараў і выяўлены адметнасці іх паўнамоцтваў у розныя перыяды і на розных тэрыторыях. Раскрыты службовыя ўзаемаадносіны губернатараў з міністрам унутраных спраў, генерал-губернатарам і віцэ-губернатарам. Выяўлены механізм губернатарскага кіравання і кантролю на тэрыторыі Беларусі. Вызначаны прынцыпы падбору начальнікаў беларускіх губерняў і складзены іх агульны сацыяльны партрэт.

*Рэкамендацыі па выкарыстанні*: палажэнні, высновы і матэрыялы дысертацыі могуць быць выкарыстаны пры правядзенні новых даследаванняў па праблемах айчыннай гісторыі, рэгіянальнай сістэмы кіравання, кадравай і саслоўнай палітыцы; могуць знайсці прымяненне пры падрыхтоўцы падручнікаў для агульнаадукацыйнай школы, вучэбных дапаможнікаў, лекцыйных і спецыяльных курсаў для вышэйшых навучальных устаноў; могуць быць карысныя пры стварэнні музейных экспазіцый, выстаў, пры падрыхтоўцы навукова-папулярных твораў, мастацкіх і дакументальных кінастужак.

*Галіна выкарыстання*: гісторыя Беларусі, гісторыя Расіі, агульная сярэдняя і вышэйшая адукацыя, дзяржаўнае кіраванне.

## РЕЗЮМЕ

### Лепешкин Евгений Николаевич
### Губернаторский корпус в Беларуси (1864 – февраль 1917 г.)

*Ключевые слова*: губернатор, белорусские губернии, функции, виленский генерал-губернатор, министр внутренних дел, вице-губернатор, административное управление, контроль, самоуправление, конфессии, социальный портрет

*Цель исследования*: выявление особенностей функционирования губернаторского корпуса и его кадрового состава в Беларуси в 1864 – феврале 1917 г.

*Методы исследования*: в работе использованы общенаучные (анализ, синтез, индукция, дедукция, сравнение, аналогия, обобщение), специально-исторические (историко-генетический, историко-сравнительный, историко-системный), просопографический, а также количественные (группировка, определение среднего арифметического, вычисление) методы исследования.

*Полученные результаты и их новизна*: комплексно изучены особенности губернаторского корпуса в Беларуси второй половины XIX – начала XX в. Прослежена эволюция функций губернаторов и выявлены отличия их полномочий в разные периоды и на разных территориях. Раскрыты служебные взаимоотношения губернаторов с министром внутренних дел, генерал-губернатором и вице-губернатором. Выявлен механизм губернаторского управления и контроля на территории Беларуси. Определены принципы подбора начальников белорусских губерний и составлен их общий социальный портрет.

*Рекомендации по использованию*: положения, выводы и материалы диссертации могут быть использованы при проведении новых исследований по проблемам отечественной истории, региональной системы управления, кадровой и сословной политики; могут найти применение при подготовке учебников для общеобразовательной школы, учебных пособий, лекционных и специальных курсов для высших учебных заведений; могут быть полезны при создании музейных экспозиций, выставок, при подготовке научно-популярных произведений, художественных и документальных фильмов.

*Область применения*: история Беларуси, история России, общее среднее и высшее образование, государственное управление.

## SUMMARY

**Liapeshkin Yauhen Mikalaevich**
**Governor's Corps in Belarus (1864 – February 1917)**

*Keywords*: governor, Belarusian provinces, functions, Vilna's Governor-General, Minister of Internal Affairs, vice-governor, administrative management, control, self-management, confessions, social portrait

*The purpose of the study*: to reveal the peculiarities of the functioning of the governor's corps and its personnel in Belarus in 1864 – February 1917.

*Research methods*: the work uses general scientific (analysis, synthesis, induction, deduction, comparison, analogy, generalization), special-historical (historical-genetic, historical-comparative, historical-systemic), prosopographical, as well as quantitative (grouping, determination of the arithmetic mean, calculation) research methods.

*The obtained results and their novelty*: the peculiarities of the governor's corps in Belarus in the second half of the 19th – beginning of the 20th century were comprehensively studied. The evolution of the functions of the governors is traced and the peculiarities of their powers in different periods and in different territories are revealed. The official relations of the governors with the Minister of Internal Affairs, the Governor-General and the vice-governor are disclosed. The mechanism of gubernatorial management and control on the territory of Belarus has been revealed. The principles of selection of heads of Belarusian provinces are defined and their general social portrait is drawn up.

*Recommendations for use*: the provisions, conclusions and materials of the thesis can be used in conducting new research on the problems of national history, regional management system, personnel and class policies; can find application in the preparation of textbooks for general education schools, teaching aids, lectures and special courses for higher educational institutions; can be useful in the creation of museum expositions, exhibitions, in the preparation of scientific and popular works, artistic and documentary films.

*Field of use*: history of Belarus, history of Russia, general secondary and higher education, state administration.

Падпісана да друку 24.04.2024. Фармат 60×84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Лічбавы друк. Ум. друк. арк. 1,63. Ул.-выд. арк. 1,75.
Тыраж 60 экз. Заказ 97.

Надрукавана з арыгінала-макета заказчыка
ў рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/63 от 19.03.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.